

**Антон ФУРС**

Дзень Перамогі маёй сям'і

Беларусь памятае… Менавіта такімі словамі пачынаюцца многія перадачы на радыё і тэлебачанні напярэдадні свята Вялікай Перамогі. Беларусь памятае пра ўсіх, хто змагаўся на франтах Вялікай Айчыннай, у падполлі і партызанскіх атрадах, а кожная сям'я – пра канкрэтнага чалавека, якога ведалі, шанавалі і любілі. Але напэўна няправільна ўжываць да гэтых дзеясловаў прошлы час, бо жывуць яшчэ дзеці салдат той вайны, жывуць унукі, жывем і мы, праўнукі. Многія з нашага пакалення нават не бачылі сваіх прадзедаў або бачылі толькі на фотаздымках, але нам расказваюць пра іх, вучаць быць удзячнымі ім, ганарыцца імі. І таму мы іх шануем і памятаем.

Мне таксама ўжо мой тата расказвае пра свайго дзядулю. А таму я ведаю, што мой прадзядуля, Фурс Пётр Нікіфаравіч, які нарадзіўся ў1922 годзе, зусім маладым трапіў на фронт, а ўжо ў 1943 годзе ваяваў на Курскай дузе, дзе ішлі цяжкія баі. Пра іх шмат напісана, зняты фільмы. Калі я глядзеў панарамныя кадры гэтай жахлівай танкавай бітвы, то думаў, што нельга без трывогі і горычы бачыць гэта ўсё на экране, а мой прадзядуля сам знаходзіўся ў гэтым пекле. У адным з баёў (а ён быў кулямётчыкам) яго цяжка параніла. Ён доўга лячыўся ў шпіталі. Успамінаў, з якой трывогай слухалі яны зводкі з франтоў, перажывалі, што дрэнна і марудна зажываюць

раны, што іх таварышы без іх змагаюцца з ворагам. Калі праводзілі тых, хто вылечваўся і зноў накіроўваўся на фронт, то ад усяго сэрца жадалі ім выжыць і перамагчы. А самі хацелі хутчэй паправіцца і прадоўжыць змаганне. Такое ж вялікае жаданне выгнаць ворагаў з роднай зямлі і маладыя сілы вярнулі ў баявы строй і майго прадзядулю.

Ужо пасля вайны яго не адправілі дамоў, а, як ён казаў сваім родным, рыхтавалі да працягу вайны на японскім фронце. Мой прадзед – сапраўдны герой. Ён узнагароджаны многімі баявымі ўзнагародамі, але галоўная яго ўзнагарода – гэта ордэн Славы II ступені. Прозвішча Фурса Пятра Нікіфаравіча занесена ў Кнігу Памяці Ашмянскага раёна. Беларусь памятае…І мы помнім…

Калі дэманструюць фільмы пра Вялікую Айчынную вайну, расказваюць пра ветэранаў ды і проста ў час размоў, мы ўзгадваем пра нашага дзядулю Пятра. А тата робіць запыты ў розныя ваенныя архівы, каб яшчэ больш даведацца пра нашага мужнага дзядулю, таму што ён не многа расказваў пра сябе. Гаварыў, што ўсе яго баявыя таварышы змагаліся самаадданa і верылі ў перамогу. Я яшчэ думаю, што яму проста цяжка было ўспамінаць, бо гэтыя ўспаміны вярталі яго ў той трагічны час, калі ён траціў сваіх баявых сяброў, бачыў многа гора і слёз.

Нізкі паклон табе, абаронца Айчыны! Нізкі паклон табе, абаронца свайго роду! Мы заўсёды так ціха кажам, калі бываем на магіле майго прадзеда.

Антон Фурс, вучань 9 “А” класа
гімназіі № 2 г. Гродна